Сяргей Законнікаў

# Гэта мы

(паэмы)

Вялейка 2006

KAMUNIKAT.org

У кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, міжнародных прэмій Польшчы і Украіны Сяргея Законьнікава “Гэта мы" увайшлі паэмы "Чорная быль", "Цівалі", "Зязюля". Эпічныя творы аўтара, вядомыя айчыннаму чытачу і перакладзеныя на іншыя мовы сьвету, з'яўляюцца паэтычным асэнсаваньнем лёсу беларускага народа, "народа на Галгофе". Яны вызначаюцца запамінальнай метафарычнасьцю, глыбінёю думак, шчырасьцю пачуцьцяў, нястомнасьцю ў імкненьні да справядлівасьці і праўды.

KAMUNIKAT.org

# Народ на Галгофе

Шмат якія народы сьвету і Еўропы прайшлі свой нярадасны, пакутніцкі шлях, шлях Дэляроса, пакуль выбіліся на сьветлую дарогу праўды і справядлівасьці. Толькі беларусы затрымаліся на тым шляху, нібы аддаючыся сада-мазахісцкай асалодзе ад сваіх нялюдзкіх пакутаў, ня надта імкнучыся пачуць нават голас Бога ці хоць бы зьведаць патрэбу спазнаць, да чаго трэба імкнуцца.

Звычайна, як і ўсе людзі, мы маем усё — ад боскага і высакароднага да подлага і нізкага, якое наканавана стрываць. Але ў дадатак да іншых на наш пакутніцкі лёс выпаў яшчэ Чарнобыль — гэты біблейскі апакаліпсіс, ад якога няма паратунку нават зьдзічэламу ваўку, што марна імкнецца выбавіцца з радыяцыйнага жаху. Створаны паэтам вобраз сапраўды набывае сэнс касьмічнай жуды, калі "паўсюль даўкі пах палыну, і ў небе — расьпятая зорка" (паэма "Чорная быль").

Пад гэтаю "расьпятай зоркай" нацыя змушана існаваць, мабыць, ад часоў пралетарскай рэвалюцыі ў Расеі. Менавіта тады Беларусь узышла на Галгофу з дзесяткамі і сотнямі "Курапатаў" на ёй. Сярод іх, безумоўна, — і нядаўна моўчкі адкрытыя "Цівалі" — жахлівае месца зьнішчэньня людзей разам з жывёлай. І нават іх пасьмяротнае вынішчэньне з дапамогай зусім сучаснага сродку тэхналагічнай эпохі — напалму. Каб не засталося ні сьледу, ні крыжа, ні памяці.

Так, сьледу на спаленай зямлі можа і не застацца, можа нічога не захавацца ў дбайна падчышчаных архівах, але ніштото не зьнікае

з душаў людзей. Людзкія пакуты і людзкая кроў бяз сьледу не мінаюцца нават на Беларусі, якая ня першае стагодзьдзе ідзе "дарогай у нікуды", дзе воля "толькі сьніцца", а "слава разьлятаецца, як дым". Каб народнае гора не разьляцелася, як дым, спакон часу існаваў фальклёр, а цяпер, пакуль яшчэ ня спрахла родная мова, ёсьць паэзія, якая ўсё бачыць і на ўсё рэагуе. Бо "сьвечку тваёй душы ў Госпада папрасіла і ў цнатлівай душы зацепліла Еўфрасіньня". А праз вякі тую сьвечку пранёс Скарына, "засьцерагчы сьпяшыў радком і крывёй Купала". Менавіта такім памкненьнем натхняўся і аўтар гэтых паэмаў Сяргей Законьнікаў.

Шмат якія радкі гэтай кнігі нясуць сапраўдныя пярліны несумненнай паэзіі, высокіх думак, адухоўлены балючым пачуцьцём неспакою за лёсы людзей і Радзімы, яе гісторыі і будучыні. Надзвычай плённым, найперш у маральным плане, бачыцца мне новы для нашай паэзіі матыў хрысьціянскага пакаяньня, уведзены аўтарам у, можа быць, лепшай паэме "Зязюля". Тым болей, што "потамі мазалём немцы каюцца", у той час як "свае прыкарытнікі нават бяду скарыстаць для нажывы сьпяшаюцца". Балючая праўда гэтых радкоў набывае маштаб асноўнай ісьціны нашага праклятага часу.

Эпічныя паэмы Сяргея Законьнікава — пранізьлівыя радкі ў нескончоным летапісе народнай бяды, сьведчаньне духоўнай патэнцыі народа, які марудна, праз боль і памылкі, нарэшце ўсьведамляе сябе і сваё наканаваньне ў сьвеце.



## Чорная быль

(паэма)

### I. Выбух

*Пажары гараць, журавы крычаць...*

*З народнай песьні*

Той вечар быў уражаньнямі поўны,
З тэатра мы ішлі дамоў памалу.
І хмарка,
Што насоўвалася з поўдня,
Гурт гаманлівы наш
Не ўстурбавала.
Яе заўважыў хтосьці: "Вунь якая!
Чарнее і расьце, прыбавім кроку..."
Ды неслася ў адказ:
"Даўно чакаем...
Хай дождж ідзе!
Ён трэба... Не размокнем..."
У блочнай і цаглянай кубатуры
Ня сьцерлася дасюль адзнака роду.
І ў горадзе сялянская натура
Захоўвае павагу да прыроды.
Усе мы — дзецi вёскі.
Як насеньне,

Вясны чакаем, каб набрацца сілы,
Каб па шляху жаданым абнаўленьня
Ад затхласьці ўцячы
На вольных крылах.
Туды ўцячы,
Дзе гнёзды нашых песень,
Дзе жаўрукі заходзяцца над лугам,
Дзе клопатна ў Прыдзьвіньні, на Палесьсі
Зямля паруе пад няўтомным плугам...

А тут яшчэ сьпектакль.
Тэатра сьцены
Рассунуў ён і ўраз спакой парушыў.
Апошні Журавель ляцеў са сцэны,
Каб раскалыхваць скурчаныя душы.

Над Беларусьсю закружыў збалела,
Журба гусьцела, разрывала грудзі.
На цэлы сьвет крычаў адчайна, сьмела
Пра ўсё, аб чым сказаць баяцца людзі.
Пра тое, што падсечана карэньне
І рушацца адвечныя асновы,
Што ўзьнікла недарэчнае стварэньне —
Народ, які жыве бяз роднай мовы.
Сыны і дочкі падаліся ў горад,

KAMUNIKAT.org

А мова засталася,
Як і маці,
Астатні век свой да канца агорваць
Ва ўрослай у зямлю,
Старэнькай хаце.
І спадчына дзядоў, якую мелі,
Пагардай растаптана і забыта...
І неяк неўпрыкмет згадаўся Мележ —
Палескі горды птах, Улёце зьбіты...

А вечар быў такі лагодны, цёплы,
І з той сасьпелай, ацяжэлай хмары
Раптоўна, дружна сыпанулі кроплі,
Шумелі ў кронах, цалавалі твары.
Блішчэлі ў парку юным лісьцем ліпы,
Над горадам вясёлка затрымцела.
Кашулі перамоклыя прыліплі
І прахалодай абдымалі цела.
І мы ішлі...
Яшчэ ніхто ня ведаў,

Што сьмерць нясе і сее дождж спорны,
Што найжахлівая з усіх трагедый
Жыцьцё ўкруціла ў атамныя жорны,
Што ўчора там —

За рэкамі,

За лесам,

Дзе чэрава сваё раскрыў Чарнобыль,

Пажарнікі — заложнікі прагрэсу —

Ад цела аддзіралі з мясам робы.

**2. Зона маўчаньня**

*Як прыйдзе ліха, то ня ўседзіш ціха.*

*Прыказка*

Агонь, радыяцыя люта зьвярэлі,

Кіпелі графіт і смала.

Ня грэшнікі,

Слаўныя хлопцы гарэлі...

І зона маўчаньня была.

Адлік пачынаўся нязнанае эры

Змаганьня жыцьця з небыцьцём.

І грукаўся,

Грукаўся кожнаму ў дзьверы

Чацьвёртага блоку разлом.

Скакалі і ў Швецыі стрэлкі прыбораў,

Еўропу трывога гняла.

Зашкальвала ўсечалавечае гора...

І зона маўчаньня была.

Пляваўся атрутнаю параю кратэр,
Злавесныя хмары плылі.
А людзі ў Нароўлі да майскага сьвята
Двары, тратуары мялі.

У вёсках гароды рабілі жанчыны,
Чаромха буяла, цьвіла...
Кацілі ад Кіева прэч лімузіны...
І зона маўчаньня была.
Паўзьлі між людзей нечуваныя чуткі,
І пухла ад іх галава.
Глядзелі з надзеяй на радыё:
"Хутка
Усё растлумачыць Масква".
Ішлі піянеры ў сьвяточных калонах,
Зьвінела парадная медзь.
Стаялі ў чаканьні нямым эшалоны:
"Як грымне,
Ці зможам пасьпець?.."

А мне і цяпер не хапае азону,
Ня выбрацца з даўкага тхла...
Яшчэ не было адгароджанай зоны,
А зона маўчаньня была.

KAMUNIKAT.org

## 3. Чаравічкі

*Абуй чаравічкі, перапёлачка,*
*Абуй чаравічкі, маладзенькая...*
*З народнай песьні*

Санаторый пад Мінскам у лесе
Стаў прытулкам палескіх дзяцей...
У пакоях ні сьмеху, ні песень,
Моўчкі, пільна глядзяць на гасьцей.
Мы прыехалі невыпадкова,
Падганяў колы хуткія страх:
На плячах у дзяўчатак — абновы,
Ды абутак адтуль — на нагах.

Вочы бліскаюць, нібы чарнічкі,
Шэпт узьняўся, а потым аціх.
"Выбірайце сабе чаравічкі..."
"А навошта? Нам добра ў сваіх".
Як пачуў іх адказ, то ня здолеў
Нават вымавіць нешта сьпярша,
Бо нязнаным, Пранізьлівым болем
Зашчымела, Зайшлася душа.
Перапёлачкі Беларусі,
Не саромцеся,
Час не такі.

kamunikat.org

Вам і ў чорнай,

Бязьлітаснай скрусе

Трэба выжыць — чакаюць вякі.

Вам ня бегаць па родных дарожках,

Лёс па іншых шляхах павядзе...

Як маланкі,

Імклівыя ножкі

Не павінны прыбіцца ў хадзе.

Вам з жыцьцём на руках,

Божа мілы,

У такую ісьці далячынь...

Чаравічкі з чарнобыльскім пылам,

Перапёлачка,

Хуценька ськінь!..

**4. Чарнобыльскі воўк**

*Прыйдзе шэранькі ваўчок,*

*Схопіць дзетку за бачок.*

*З калыханкі*

Рыжы Лес ён у прыцемку майскім пакінуў,

Бо адчуў кожнай клеткай — настала пара.

Цэлы месяц раўлі верталёты, машыны

І палала ў нябёсах чужая зара.

Гэты жудасны гул і нязвыклае зьзяньне

KAMUNIKAT.org

Цела ціснулі долу,
Душылі,
Гнялі.
І спрадвечны інстынкт падказаў,
Што скананьня
Дух злавесны сышоў на абшары зямлі.
Той зямлі,
Дзе з шчаняці ён вырас у зьвера,
Дзе ў раз'юшанай бойцы
Сяброўку займеў,
Дзе на месяц зімой
Іклы вострыя шчэрыў,
Дзе лятаў,
Як віхор,
Па здабычу між дрэў.
Больш ня будзе таго,
Бо жывое — маўчала...
Ён апошні.
А грукат жалезны мацнеў.
І тады воўк завыў у бясьсільным адчаі,
Мох заскуб кіпцюрамі,
Каб сьцішыць свой гнеў.
Ён адчуў у грудзях
Боль тупы, недарэчны,
Перад ім матылі,

Як сьцяжкі,
Паплылі.
Ірвануўся, пабег.
Злосьць і вецер сустрэчны
Разьдзімалі зялёных вачэй вугалі.
Ён яшчэ не згубіў неўтаймоўную сілу —
Слабасьць возьме ў глухія ціскі спакваля.
Як раней,
Напіналіся пругкія жылы
І з-пад лапаў назад адлятала зямля.
Востры нюх вёў туды,
Дзе жывое паветра,
Дзе ня падала семя атрутнай жуды.
Ён шукаў дзікі неруш,
Дрымотныя нетры,
Каб забіцца ў гушчар ад нязнанай бяды.
Праз усю Беларусь па чахморных закутках,
Абмінаючы вёскі,
На поўнач ён бег.
Чым далей,
Тым дарога была ўсё пакутней,
Не вярталіся сілы,
Хоць большаў начлег.
Воўк качаўся ў траве,
У расе срэбна-золкай,

Бо здавалася зьверу, што кроў аж кіпіць.
Ён даўно ўжо ня еў,
Скуб гаючыя зёлкі
І жаваў іх,
І зноўку хацелася піць.
Пад лаўжом каля лужыны сьцішыўся нашча,
На зьмярканьні пракінуўся —
Страшны быў сон,
Быццам вогнішча тлела ў разяўленай пашчы
І гула галава,
Як раз'ятраны звон.

Прад вачыма плылі танканогія цені,
Вось адзін пахіснуўся і сьцішыў хаду.
Смага кінула тут на калені аленя,
Ён смактаў прагавіта рудую ваду.
Дух ваўчыны пачуў,
Ірвануўся нябога.
Воўк жа ўсьлед паглядзеў і падумаў:
"Жыві..."
Не хацеў ён, зьнясілены, болей нічога —
Ані плоці жывой,
Ані сьвежай крыві.
Так ляжаў,
Распластаны натугаю нейчай,

Што сьціскала,

Душыла люцей і люцей.

Не зьвярынай сьлязой,

А сьвятой, чалавечай

Плакаў той,

Кім палохаюць людзі дзяцей.

Потым з пасткі сьмяротнай

Да страчанай волі

Воўк ня бег,

А, зубамі скрыгочучы, поўз...

Зноў на поўнач — гаямі,

Лагчынамі,

Полем...

Касмылямі спаўзала,

Сьвяцілася поўсьць.

Ля Валожына трасу, што млела ад газаў,

Ён адолець ня змог,

Бо прыйшло забыцьцё.

Не адчуў,

Як прад колам вялізнага "КрАЗа"

Хруснуў глуха хрыбетнік і счэзла жыцьцё.

Гэты выпадак дзіўны вадзіцеля ўсьцешыў,

З маньціроўкай саскочыў з падножкі далоў:

"О, якая здабыча!"

Ды ўбачыў ён плешы,

KAMUNIKAT.org

На якіх запяклася счарнелая кроў.

"Не, з такое здыхляці мне шкуры ня трэба..."
Злосна дзьверцамі ляснуў і рушыў у шлях.
Воўк ляжаў на баку, пазіраючы ў неба...
Адбіваліся зоры ў халодных вачах.

**5. Дождж у Хойніках**

*А зелена, зелена траўка на мяжы,*
*Таму яна зелена, бо ідуць дажджы.*
*З народнай песьні*

А дзядзька не зважае на грымоты,
На тое, што даўно да ніткі змок.
На руль павесіў сетку з хлебам, боты,
Упарта кантралюе хісткі крок.
Ці ён веласіпед, ці той памалу
Вядзе яго то проста, то бачком.
І з боханаў,
Дарэшты набрынялых,
Вада рудая коціцца цурком.

Кабеты, што аўтобуса чакаюць,
Махаюць з-пад страхі:
"Ідзі сюды! Ты б хлеб акрыў.

Скрозь пошасьць... Ды якая..."
А ён бубніць сабе: "Ані бяды...
Мне страхі вашы — плюнуць і расьцерці,
П'ю малако і ўсё з гарода ем.
Я і на фроньце не баяўся сьмерці...
Калі жывыя будзем — хрэн памрэм!"

Старая хрысьціцца:
"І як ня брыдка! Пажылы чалавек, і так казаць...
Я за цябе старэйшая, Мікітка,
Паслухайся мяне, ідзі ты спаць".
Суседка засьмяялася:
"Алена, Ці ж ты яго ня бачыш па лычы?
Яму сягоньня мора па калена,
 Відно, пакупкі добра замачыў".
А дзядзька:
"Замачыў, бо ёсьць прычына.
Ды вам, квактухам, гэта не паняць...
Ад стронцыю,
Як раіць медыцына,
Найлепшая вакцына — чарку ўзяць!"
Старая шэпча:
"Чаркай толькі бельмы
Зальеш, ды не пазбудзешся пакут...
А дзе ты купіш, знойдзеш тое зельле,

KAMUNIKAT.org

Каб вылечыць зямельку,

Родны кут?

А я палю і паліваю грады,

Сьляза мая сама сабой бяжыць...

Ні сонейку,

Ні дождж ыку

Ня рады,

Дык для чаго тады на сьвеце жыць?.."

Замоўклі ўсе...

І дзядзька стаў цьвярозы,

Ён змог веласіпеду рады даць.

Пайшоў на дождж і адвярнуўся.

Сьлёзы

Былі цяпер кабетам не відаць

**6. Трэці анёл**

*Чужую бяду рукамі разьвяду.*

*Прымаўка*

Хоць людзі не хацелі, ды плылі

На трэцяй хвалі высяленьня з зоны...

Здалося, круг зрабіў вакол Зямлі

"Уазік", што абпоўзаў паўраёна.

Каля гасьцініцы змахнуў я пыл,

KAMUNIKAT.org

Твар потны спаласнуў вадой халоднай.
А есьці не было ніякіх сіл —
Разьбіла ўшчэнт журбой неверагоднай.
Хацелася зваліцца і заснуць,
Ды так,
Каб болей гэты сьвет ня бачыць,
Каб не замольваць страшную віну
За тое,
Што ня можаш перайначыць
Нічым ніколі палыновы дзень
З сьляпучым сонцам у смузе варожай,
Дзе і зямля, і тысячы людзей
Заложнікі,
І ты між іх — заложнік...
Ішоў каля запыленых машын,
Што ў белы сьвет паўзьлі
З сялянскім скарбам,
Ня мог глядзець у вочы тых жанчын,
Якія небу пасылалі скаргі.
Я — проста чалавек.
Як разьвяду
Жах новы вавілонскага зрушэньня?
Сасьмяглым горлам піў,
Каўтаў бяду,
Аглухлы ад жальбы і галашэньня.

Я ведаў —
Тут бясьсільны нават Бог,
Але, наскрозь прабітаму трывогай,
На скрыжаваньні хойніцкіх дарог
Хацелася мне стаць на хвілю богам...

Хістаў таполі вецер за акном,
Чарнобыльскай гадоўлі хіжы вецер.
І сьніўся мне бязладны страшны сон,
Нібы адзін застаўся я на сьвеце.
Зямля ляцела ў прорву,
А наўзбоч
На воблаках трубілі сьмерць анёлы...
Да скону буду помніць тую ноч,
Бабульчын ціхі шэпт у сьценах голых...

Бабуля ў Бога верыць пачала
Пасьля, здаецца, шостага дзесятка.
Да гэтага ня тым яна жыла —
Крыж несла на гарбу ўдавы-салдаткі.

Яе мужык даўно сканаў ад ран,
Пасечаны сьвінцом на грамадзянскай.
І мусіла ўзьнімаць жыцьця дзірван
Спрадвечнай цягавітасьцю сялянскай.

KAMUNIKAT.org

Хатуль цяжкі на плечы ўськінуў лёс —
Яна і тры маленькія дачушкі.
Не высыхала ад бяссонных сьлёз
Да новае начы яе падушка.
Але на людзях ні сьлязінкі ўдзень,
Як камянела,
Каб набрацца сілы.
Кароў даіць — больш важкі працадзень.
А жыць жа трэба.
Трыццаць год даіла.
Дамоў з калгаснай фермы прыбяжыць,
А там раве ў хляве свая карова.
Штогод араць, палоць і малаціць,
Яшчэ клапоты —
Сена,
Подсьціл,
Дровы.
А потым перуном па ёй вайна,
Падпальвалі фашысты двойчы хату.
Ды з новай, што агорала яна,
Як ластаўкі,
Ляцелі ў сьвет дзяўчаты.

Да скону лёгкай на нагу была,
То да адной, То да другой — дарога.



kamunikat.org

Калі на ногі ўнукаў падняла,
Тады бабуля ўспомніла пра Бога...
Нядзеля.
Вечар.
За сталом сядзім
Мы з ёй на кухні.
Галава пустая —
Задачка не выходзіць, і прытым
Пад нос бабуля Біблію чытае:
"*І трэй-ці Ан-гіл за-тру-біў,*
*і зва-лі-ла-ся зь не-ба вя-лі-ка-я гвяз-да,*
*га-ру-чы, як лян-па,*
*і па-ла на трэй-цю-ю часьць рэ-каў*
*а на жа-ро-лы во-даў.*
*А і-мя та-е гвяз-ды Па-лын;*
*і трэй-ця-я часьць во-даў ста-ла па-лы-ном,*
*і шмат лю-дзёў па-мер-ла з во-даў,*
*бо я-ны ста-лі гар-кі-я".*

Уздрыгваю, бо мроіцца ў акне
Анёл з трубой,
І ў сенцах чую крокі.
"Бабулька, не палохай ты мяне,
Бо праз цябе ня вывучу я ўрокі".
Яна злуецца: "Не перашкаджай.



KAMUNIKAT.org

Чаго разьвесіў лапухамі вушы?

Мяне ня слухай.

Сеў рашаць — рашай!.."

І зноў сухімі вуснамі варушыць...

Кідаўся ад сьцяны і да сьцяны

Мой ложак і валок у пашчу згубы...

І чорныя,

Як вугаль,

Груганы,

А не анёлы,

Узьнімалі трубы.

**7. За калючым дротам**

*Зарасьлі мае сьцежкі, Ой зарасьлі мае дарожкі Зялёненькім лапушком. Зялёненькім лапушком, А ўсё горкім палыном. Зялёненькім лапушком Пасьцелечку пасьцялю. А з горкага палыночку Згалоўейка закачу.*

*З народнай песьні*

Затрымалі ў зоне раніцой бабулю.

"Што ж вы гэта робіце? Ці загад ня чулі?

Скрозь жа радыяцыя, гэта ж не навіна.

Дык жыўцом навошта лезьці ў дамавіну?

Дык чаму блукаеце вы па зоне ўпотай,

kamunikat.org

Што, каго шукаеце за калючым дротам?"
Ля сялібы роднай, быльнягом урослай,
Слухала салдатаў як дзіцё дарослых.
Зьнізу ўверх глядзела з-пад брывоў сівенькіх,
Выцірала сьлёзы чорнай, ссохлай жменькай:
"Вы, сынкі, ня бойцеся...Што ўжо мне пашкодзіць?..
Дзеці не пускалі, уцякла, як злодзей.
Самі мае ножанькі прывялі дадому
Шляхам невядомым, сьцежкаю знаёмай.
Вы ня лайце, дзеткі... Паглядзець ахвота,
Як тут наша хатка за калючым дротам?
Вось яе адведала, і лягчэй мне стала,
Можа, і знайшлося тое, што шукала".
Як зямелька — рукі, як валошкі — вочы,
Як не пашкадуеш, хочаш ці ня хочаш.
"Ну да агароджы прыбрылі... А потым?"
"Трохі падкапалася, прапаўзла пад дротам..."
Рагатнуў старэйшы: "Дыверсант, і толькі!
А што ж тут схавалі пад крысом ватоўкі?"
"А нічога... Кут мой каля ложка голы...
Не забрала ў тлуме абразок Міколы.
Вось ён, мой балесны,... Твар яму абмыла.
Бач, як засьвяціўся, вызвалены з пылу".
"Ну пайшлі, бабуля! Зараз на машыне
Наш шафёр да станцыі хуценька падкіне".

Між хлапцоў плячыстых крочыла памалу,
Ды каля варотаў запратэставала:
"Вы сабе служыце, не ідзіце сьледам.
І сюды прытупала, і назад даеду..."
Засьвярбелі вочы...
Моўчкі, вінавата
Цыгарэты ў вуснах сьціснулі салдаты...
Потым паглядзелі, ды за паваротам
Зьнікла ўраз старая, як і не было тут.
Толькі ў чыстым полі, што ня сьпеліць колас,
Быццам шолах жыта, чуўся ціхі голас:
"Вы ня лайце, дзеткі...
Добра мне... Паверце...
Хатку паглядзела, можна і памерці..."

**8. Марадзёры**

*Ой ты, воран чоран...*
*З народнай песьні*

Адным на ўсё жыцьцё — пакуты, гора,
А гэтыя з бяды куюць рублі.
Паўзуць,
Паўзуць, як вошы, марадзёры
Па нежывой, атручанай зямлі.
Б'юць вокны,
Крышаць ломікамі дзьверы,

KAMUNIKAT.org

Хоць і цурчыць па карку ліпкі жах.
Пакінутыя хаты і кватэры
Абмацваюць, як трупаў, па начах.
Сьпяшаюцца,
Грабуць гарэлку, рэчы,
Зьдзіраюць,
Бо ў цане,
І абразы.
Ня трэба ўзвальваць ім дабро на плечы,
Матарызованыя ёсьць вазы.
Пачырванее ад натугі морда —
Не падцаецца,
А такі каўнер!
Якая прыгажуня носіць горда
Хамут радыяцыйны той цяпер?
Дарунак — тэлевізар каляровы —
Галантны хмыр
Любоўніцы прывёз.
Рэактар свой у хаце.
Будзь здаровай!
А ён сюды ня суне болей нос.
І фонд бібліятэк яны глядзелі:
Сьлед ботаў —
На Купалавых тамах.
Як бомбы замаруджанае дзеі,

kamunikat.org

Пайшлі гуляць у сьвет
Друон, Дзюма.
Паўзуць,
Паўзуць, як вошы, марадзёры
Ня толькі ў зоне.
Іх у нас — спаўна.
І нішчаць,
І бяруць дзяржаву зморам,
І як яшчэ дасюль ліпіць яна?
Мы ўсе для іх —
Даступныя мішэні...
Хто ж корміцца з крутога мазаля,
Каб выжыць,
Выварочвае кішэні
Да самага апошняга рубля.
Нялёгка ад зарплаты да зарплаты,
Ад пеньсіі да пеньсіі трываць.
А побач злодзей, Прайдзісьвет закляты,
Па рэстаранах можа глякаваць.

А ты кусай счарсьцьвелую скарынку,
Бяззубы інвалід або ўдава.
У марадзёраў з ценевага рынку
Не забаліць па гэтым галава.
У іх ужо мільярды ў абароце,

Пляваць ім на дзяржаву і закон.
Яны трымаюць у сваёй аброці І тых,
Хто ўлез у верхні эшалон.
Ды закрані ці паспрабуй праверыць
Пяшчотныя адносіны радні:
Той мафіі,
Якая на паверхні,
З той мафіяй,
Што недзе ў глыбіні.

Закруціцца бяз рыпу кола згоды,
Што можна і ня можна пойдзе ў ход.
І зноўку станеш "ворагам народа",
Хоць галаву кладзеш ты за народ...
Глядзіць на нас,
Разгубленых,
З дакорам
Наступны дзень,
Яго рашаем лёс...
Паўзуць,
Паўзуць, як вошы, марадзёры...
І хто іх спыніць?
Дзе Ісус Хрыстос?

kamunikat.org

**9. Вяртаньне**

*Старана мая, ты староначка,*

*Старана мая незабытая,*

*Не магу цябе прызабыціся,*

*Ні ўночы сплючы, ні ўдзень ходзячы.*

*З народнай песьні*

Памёр стары.

Сканаў з наказам дзецям,

Які шаптаў, аж покуль не заціх:

"Ніколі... не бадзяўся я... па сьвеце...

Хачу ляжаць... на могілках... сваіх..."

Ня ведаў ён, якая цяганіна

Пачнецца для журботнае радні.

Спачатку не выпісвалі машыну,

Хоць сотню вёрст агорвай на кані.

А потым не пускалі іх у зону,

Ноч адбылі ў машыне ля труны.

І ўсё ж былі вароты адамкнёны,

І да пагоста рушылі яны.

Высокі бор стаяў жалобнай вартай...

І сын сказаў пасьля такіх трывог:

"Нічога, бацька...

Мы — народ упарты.

І ўсё-ткі ты ў пясочак родны лёг..."

У зоне пуста.

Толькі вінаваты,

Як спадцішка,

Дымок над камінком.

Старыя людзі ўваскрасілі хаты,

Жывуць сабе, як схімнікі, крадком.

На ўсе ўгаворы дзед махае кіем:

"Нікуды!

І дарма агітаваць.

А вашы тры чырвонцы грабавыя

Ня трэба.

Дайце век дагараваць!.."

І сырадой бабуля зноўку цэдзіць

У спрытныя старыя гарлачы,

І з малаком цячэ праз марлю цэзій...

Хто ў гэтым лёсе можа памагчы?!.

Хоць зарасьлі дарогі палявыя,

Хоць у бары зязюльчын голас змоўк,

Перасяленцы —

Мёртвыя,

Жывыя —

Вяртаюцца, вяртаюцца дамоў...

**10. Пераліваньне крыві**

*Кроў — не вада, разьліці шкада.*

*З народнай песьні*

На зялёнай клумбе — мак чырвоны,
А далей — бетонная сьцяна.
Вось і ўвесь пейзаж, які штодзённа
Ім відаць з бальнічнага акна.

Хочуць зьліцца з небам вачаняты,
Носікі прыціснуты да шкла.
Чорны сьмерч у белыя палаты
Вынес іх з далёкага сяла.

Адарваў ад матчынае ласкі,
Ад любімых гульняў і сяброў.
Дзеці,
Нібы скошаныя краскі,
Вянуць,
Бо бяда — бялее кроў.

Працэдуры, як закон, бяз слова,
Быццам шмат было іх на вяку.
Падстаўляе пацыент чарговы
Тоненькую, лёгкую руку.
Ён маўчыць, хоць вусны пабялелі,

KAMUNIKAT.org

Ён трывае лепей, чым стары.
Мо таму сьлязой і накіпелі
Вочы маладзенькай медсястры.
З вены кропельку зьнімае ватай
І руку бінтуе,
І тугу.
Каб ня ўчулі, шэпча вінавата:
"Болей не магу я...
Не магу..."

## 11. Страх

*Біце камень, біце,*
*Агню даставайце.*
*З народнай песьні*

Хоць выйшлі на сьвятло з глухіх скляпеньняў,
Але яшчэ адкрыць баімся вочы.
Свабодна выціснуць з душы здранцьвеньне
І рабскую пакорлівасьць ня хочам.
Такія мы.
На гэта ёсьць прычына —
Жылі ў краіне лагернай, астрожнай,
Жывёльны страх перад плюгавым чынам
Зьвіваў сабе гняздо ў крывінцы кожнай.

Стаў нацыяналізм тутэйшай тэмай,
Як шуфлем,
Лепшых пад яго гарнулі,
Пяклі з даносаў справы на "нацдэмаў",
Дзе кропку у канцы стаўляла куля.
А зьверху над цівунскім, хіжым збродам
Стаяў "наш бацька"
Самай строгай вартай.
Ён не людзей, а цэлыя народы
Зьнішчаў ці тасаваў,
Як шулер карты.

І чорны воран баляваў начамі,
Ён каркаў і вучыў усіх бяз стомы,
Што можна выйсьці ў "людзі",
У "начальства"
Цаною здрады самаму сьвятому.
Сваімі крыламі ў крыві пялёхаў,
Іх разьвінаў над лёсамі з размахам.
І так дзядоў,
Бацькоў ён запалохаў,
Што будуць праўнукі дрыжаць ад страху.

Ды вось глыток жаданае свабоды,
Свабоды мудрых думак,

KAMUNIKAT.org

Творчай працы.
І кожны можа для свайго народа,
Для будучыні нашай пастарацца.

Рабочыя, сяляне, інжынеры,
Вучоныя, настаўнікі, паэты —
Мы ўсе — адна сям"я з высокай верай...
Калі ж нарэшце зразумеем гэта?
Зноў дзеляць нас на "чыстых" і "нячыстых",
Запрэгчы хочуць у старую збрую.
Ня толькі ў скверах з кульбай —
Сталіністы,
Яны яшчэ і судзяць, і кіруюць.

А з імі тыя, хто ў сваё карыта
Дабро піхаў, каб аж падняўся коптур,
Хто кроў смактаў з дзяржавы
І адкрыта
Ёй гандляваў у розьніцу і оптам.
І чорны крук не адляцеў далёка
(А век у072 ругана гадоў пад трыста!),
Глядзіць,
Глядзіць на нас крывавым вокам,
Дзе ў зрэнцы помста сьвеціцца агніста.
Хто праўду скажа,

Тым — праклён, пагрозы
Або дубінкі, газы — не іначай...
Калі памёр тыран, ліліся сьлёзы...
Чаму па мове, мой народ, ня плачаш?
Чаму ня скажаш:
"Патрабую школы Вярнуць
І ўсё, што з гэтым заняпала,
Каб годна, вольна ў гарадах і сёлах
Маё сьвятое слова загучала"?
Чаму ня хочаш з крыўдаю змагацца
І галаву ўгінаеш моўчкі ў плечы,
Калі зямлю — На ўсе вякі багацьце —
Дачасьнікі і труцяць, і калечаць?

Чаму не разумееш і дагэтуль,
Што ловішся на простую нажыўку,
Калі табе з чыноўных кабінетаў
Даюць адобрыць зжоўклую фальшыўку?

Ты столькі вынес і пакут, і гора,
Што заслужыў навечна, назаўсёды
Мець лёс не нарыхтоўчае канторы,
А роўнага між роўнымі народа.

Сыноў,

kamunikat.org

Што з вераю жыцьцё вянчалі,

Ці ж мала Беларусь узгадавала?

Стаяць, як знак ахоўны, за плячамі

Скарына,

Каліноўскі

І Купала.

Народ мой,

Слухай голас іх прарочы,

Ён нездарма трывожыць гаркатою.

Прачніся,

Адкрывай шырока вочы,

Не разьмініся з праўдаю крутою.

Калі ж і зараз ты не загукаеш,

А будзеш жыць

Пад страхам і прынукай,

Чарнобыль не такі яшчэ чакае

Тваю зямлю,

Тваіх дзяцей і ўнукаў...

**12. Віна**

*Трава палягла, журба абняла.*

*З народнай песьні*

Жыцьцё пакутамі аплоціш,

Яму ня трэба ні граша...

Як птушка,



KAMUNIKAT.org

Б'ецца ў клетцы плоці,

Баліць,

Шчыміць мая душа.

За ўсё павінна быць расплата...

З зямлі сваёй куды ўзьляціш?

І мусіш, хоць невінаваты,

Чужых злачынстваў несьці крыж.

Я вінаваты, Вінаваты,

Бо гвалт і зьдзек ня змог спыніць.

Той кожны стрэл у Курапатах

Адчаем у грудзях зьвініць.

Я вінаваты, бо калеюць

Людскія сэрцы —

Сівер дзьме

Адтуль,

Дзе костачкі бялеюць

На Салаўках і Калыме.

Я вінаваты, бо наўкола

Упадак духу так відаць,

Што продкі абурэньня голас

З магілаў змушаны падаць:

"А тым, хто мову, род адрынуў,

KAMUNIKAT.org

Як подлы раб, сагнуўся ў крук,
Настаў свой меч паміж рабрынаў,
Цаляй туды, дзе сэрца стук".

Я вінаваты, бо атрутай
Засыпала маю зямлю,
А я адданасьцю прыкуты,
Яшчэ мацней яе люблю.

Я вінаваты, бо ў заторах
Сваіх грабежніцкіх уцех
Згубіў сябе,
Сабе ўжо вораг
Сам чалавек,
І быць ім — грэх.

Таму вяду з душой гаворку,
Гляджу ў нябёсы ўсё часьцей,
Бо назірк Палыновай зоркі
Змушае жыць сьвяцей, чысьцей.
Душы, затурканай, зьнямелай,
Нялёгка загартоўваць дух,
Каб выйсьці ў сьвет,

Вярнуцца ў цела

І разарваць замкнёны круг.
Але яна сьмялее гонка,
Каб далеч волі адкрываць,
Як карабельная сасонка,
Што можа небу паківаць.

Багоў зямных мы робім самі,
Куем наменклатурны штат,
Каб потым стаць прад іх вачамі
І выканаць любы загад.
Праз цемру рабства пакаленьні
Прайшлі,
Каб кожны ўведаць змог,
Што толькі ўласнае сумленьне —
І першы,
І адзіны бог...
Так і жыву.
Жыцьцё — віною.
Ня час, а кроў мая цячэ.
І тое, што было са мною,
Усё паўторыцца яшчэ...
Паўторыцца яшчэ...
Яшчэ...

KAMUNIKAT.org

## 13. Палыновая зорка

*Ой, палын мой, палыночак,*
*Палын — горкая трава,*
*Гарчэй цябе, палыночак,*
*Ва ўсім полі ды няма.*

*З народнай песьні*

Накатам сівая трава,
Як дым, наплывае пад ногі...
Бялее мая галава,
Ня можа пазбыцца трывогі.
Як волі, Паветра глыну,
Ды стане ня сьветла, а горка.
Паўсюль даўкі пах палыну
І ў небе - расьпятая зорка.

Глядзіць Беларусь на мяне,
Чарнеюць кругі пад вачыма.
Народ можа верыць мане,
Зямлю падмануць немагчыма.
Нібы да грудзей немаўля,
Да родных пагоркаў тулюся.
Збалелая маці-зямля,
Я толькі табе павінюся.
Ня хочацца класьціся ўдол,
Ня маючы ў сэрцы надзеі,

kamunikat.org

Што ты саўладаеш з бядой
І верай нашчадкаў надзеліш,
І стануць яны гаварыць
Прыветліва моваю наскай:
"Дзень добры! Заходзьце, сябры,
У хату да нас. Калі ласка!"
...Маўчыць, нібы камень,
Зямля,
Палын невядомасьцю сьвеціць...
Што будзе,
Што будзе пасьля? —
Ня скажа ніхто ў гэтым сьвеце.
Ёсьць праўда адна —
Праўдай жыць,
Няхай і суровай, і горкай...
У небе над намі стаіць,
Як зьніч,
Палыновая зорка.

*1988*

**Цівалі**

(паэма)

**Уступ**

*Іржаў сівы конік, яго везучы,*

*Крычаў чорны воран, за ім летучы...*

*З народнай песьні*

Крывіцкім духам цягне ад зямлі,
А камень, што на сэрцы, не падняць...
Па цаліку праз вольныя палі
Мкне вершнік, не шкадуючы каня.

Удвух яны пільнуюцца зары,
Якая пакідае белы сьвет.
Яна вось-вось патухне,
Дагарыць,
Ды застаецца непагасны сьлед.

І ён, і конь адтуль, Дзе грукаў бой,
Крывёю мецяць сьнегавы абсяг.
І ўжо зямлю атульвае сабой
Навечна Бел-чырвона-белы сьцяг.

У правай — меч,
У левай — павады,
Рукам ня млосна, хоць сьцякае кроў.

kamunikat.org

Мкне вершнік за падмогаю сюды,
Ды не стае ў Айчыне ваяроў.

Праспалі долю людзі і званы,
І лёг на душы ўсім сьмяротны грэх...
Зноў сыта чысьцяць дзюбы груганы,
Хапаючы з сумётаў прагна сьнег.

**Праўда з таго сьвету**

Горад начны закалыхваюць сны...
А на балконе бетоннага гмаха
Стаў чалавек
Побліз шэрай сьцяны
І размаўляе з даверлівым птахам.

Нібы анёл,
Белы голуб зьляцеў
З дымнага і непрытульнага неба,
Дапамагчы чалавеку хацеў,
Бо адчуваў —
Ёсьць такая патрэба.

Сеў на парэнчу,
Прыціх галубок,

kamunikat.org

Крышку прымружыў
Разумнае вока
І, галаву нахіліўшы набок,
Слухае споведзь
Душы адзінокай:
"Доўга мяняў я
Куток за кутком,
Доўга з сям"ёй пра жытло сваё
Марыў.
А засяліўся сюды ў новы дом —
Спаць не магу,
Бо даймаюць кашмары.
Ледзьве суцішуся і задрамлю,
Мроіцца зноў,
Што пад домам —
Магіла,
Што разграбае з магілы
Зямлю
Нейкая нечалавечая сіла.

Там між шкілетаў жывёлы
На дне,
Густа аблеплены
Глінай іржавай, Бацька ляжыць.
Ён гукае мяне,

Толькі ня голасам —

Дзікім іржаньнем.

Конскаю грываю

Сьцелецца чуб,

Зубы вялізныя неверагодна...

Я ў тую прорву лячу

І крычу,

І прачынаюся ў поце

Халодным..."

Змоўк чалавек.

Твар — шарэй ад сьцяны.

Шнурам бікфордным

Дыміць цыгарэта.

Голуб-анёл кажа:

Гэта ня сны...

Праўда вяртаецца

І з таго сьвету..."

**На Беларусі — мор**

На Беларусі — мор.

Мор — у кожную хату і двор.

На жывёлу — эпідэмія:

Сібірская язва,

Яшчур,

Сап

Ды пошасьць, якой ня чулі.

На людзей —

Класавай нянавісьці інфекцыя:

У Сібір,

На Поўнач — этап

Або ўпатыліцу — куля...

На Беларусі — мор.

**Цівалі. Ноч**

*Перад вайною па загаду наркама Л. Кагановіча "за сабатаж" — адмову везьці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў — была расстраляна вялікая група беларускіх чыгуначнікаў. Каб схаваць злачынства, іх целы энкавэдысты сьцінулі каля вёскі Цівалі пад Мінскам у могільнік жывёлы, якая сканала ад эпідэмій. Такія месцы, па санітарных правілах, нельга раскапваць на працягу ста гадоў.*

Нясамі ішлі,

Пад руляй вялі

Людзей да магілы,

Да рысы апошняй.

Ня спалі, уздрыгвалі Цівалі —

KAMUNIKAT.org

Кляваў цішыню
Рэвальверны пошчак
Ля ямы страшнай
Ня енчыў ніхто —
Расстаньне са сьветам
Ня зараз адчулі.
Але выдыхалі грудзі: "За што?"
Адказам былі толькі кулі, Кулі.
А што балакаць:
Каму — у расход,
Каму — да чаркі,
"За вредность" даплаты...
Ляцелі целы ў гнільлё і смурод,
Дзе чэрві абселі
Чэрап рагаты.
Рыдлёўкі абрушвалі на людзей
Зямлю...
Не крышылася тлустая гліна...
Пасьля камендант туды паглядзеў
І цыркнуў Ляніва, праз зубы
Сьлінай.

## Цівалі. Раніца

*"Утро нашей Родины" — так называлася карціна, на якой быў намаляваны не нізенькі, не васпаваты, а надзвычай прыгожы, велічны, у сьветлым фрэнчы, з плашчом, перакінутым цераз руку, Сталін на фоне майскіх садоў, палёў, фабрык і заводаў. Рэпрадукцыю гэтай карціны, якая вісела шмат у каго ў хатах, я помню змалку.*

Сонца будзяць пеўні хрыпла,
Печам хочацца агню.
І дынамік гучным рытмам
Разганяе цішыню:
"Утро красит нежным светом
Стены древнего Кремля..."
А на могільніку гэтым
Яшчэ варушыцца зямля.

## Сон Лысоні

*Вол бушуе — Вясну чуе,*
*Карова раве — Вясну заве.*

*З народнай песьні*

Зіма свой пасад саступае вясьне,
Зямля набухае, як цёплае вымя...

KAMUNIKAT.org

"І я ўспамінаю...
Сюды да мяне
І гукі, і пахі прыходзяць жывымі.

Заўжды гаспадыня ўставала да дня.
Адна.

Дзе ж тут будзеш лянівай ці соняй?
Падоіць раней,
Каб за шыю абняць,
На вуха шапнуць:
"А мая ж ты, Лысоня..."

Удзьвюх мы брыдзем,
І мядовы лужок
Расою нам ногі халодзіць,
Іскрыцца.
Густая трава запавольвае крок.
Я тут — парабчанка,
Але — і царыца.

Шурпаты язык мой да працы прывык,
І зубы — ня зломкі:
Аж капае сьліна...
Карова,

Як вечны жыцьця рухавік,
Ніколі ня ведае стомы і спыну.

Шчырую,
Бо радасьць у двор прынясеш,
Калі пад рукою ласкаваю звонка
Прапахлы расою і мятай капеж
Пачне цуруболіць па днечку даёнкі.

А потым прад дзецьмі па чыстым стале
Разыдуцца кварты з густым сырадоем.
І смачным ім здасца ацесьлівы хлеб,
Хоць ён напалам з лебядой і бядою.

Вось так і жылі мы —
Сямейка,
Радня,
Але гора ліпне да долі сірочай...
Сканала ўначы я,
А маці да дня
Усё абцалоўвала мёртвыя вочы.
І зараз,
У вечным, нязбудлівым сьне,
У ліпкай,
Як хлеб той,

kamunikat.org

Ацесьлівай гліне,

Яшчэ не аціх,

Даганяе мяне

Балючы і роспачны

Плач гаспадыні:

"Ой, мая карованька,

Ох, мая карміліца,

Да каго ж буду даіці,

Да чым жа буду дзетак карміці?

Ох, мае ж дзетанькі,

Якія ж мы нешчасьлівыя —

Людзкія дзеці будуць малачко піці,

І вы ж будзеце мяне прасіці..."

**Сон Варанога**

*Конік ты мой, конік, чаго ж ты ня весел,*

*Буйную галоўку ў калінaчкі зьвесіў?*

*Ці я табе цяжак, ці я табе важак,*

*А ці табе туга шоўкава папруга?*

*Бяжыць конік,*

*Бяжыць конік дарогаю, да гэй!*

*Не якою — шырокаю!*

*З народных песень*

KAMUNIKAT.org

Пад цяжкім скляпеньнем магілы
Ня ўцямлю я:
Жыў ці ня жыў?
Рыпелі натруджана жылы,
Напятыя так,
Як гужы.
Я — конь беларускі.
Той шэрай,
Мужыцкае долі — цягло.
Ды хочацца ўсё-ткі прымерыць
І мне — Не хамут, А сядло.
Як вецер стрыножаны,
Грыва
Зьмятае нуду і прымус.
Дык што ж ты стаіш палахліва
Прад лёсам сваім, беларус?
У вечнасьць пралегла дарога,
Шырокая,
Быццам душа.
Сядлай жа мяне,
Варанога, —
Засьвішчуць стагодзьдзі ў вушах!..

**Сон машыніста Калейкі**

Плыве прад вачыма дэпоўская сьцежка:

Бяжыць да мяне па гасьцінец
Сынок.
Замурзаны тварык.
Шчасьлівая ўсьмешка.
А ў небе над сьцежкай — жаўрук,
Як званок.
Ды памяць спыняцца на сьветлым
Ня хоча,
Высьвечвае з цемры
Начны эшалон,
Дзе бліскаюць зьнічкамі
Сумныя вочы
З аплеценых дротам калючым
Акон.
Ахоўнік мардаты
"Гарбузікі" лушчыць,
На ім партупея сьвяточна рыпіць,
Як сьнег пад нагамі.
А з кожнай цяплушкі
Даносіцца стогн,
Поўны жудасьці: "Піць..."
Тры дні без вады...
І сьлязою салёнай
Зноў поіць матулі
Сасьмяглых дзяцей...

Хто я?

Машыніст.

Ды цяжар іх праклёнаў

Раструшчвае цела і розум гняце.

Яшчэ сутыкнуцца віна і расплата...

Чыгункай нятолі грукоча цягнік,

Дзе рэйкі і шпалы —

Бясконцыя краты,

Дзе самы апошні прыпынак —

Тупік.

**Цівалі. Пекла**

Белполк угрызаўся у дол,

У той сьвет,

Які захапіла зараза.

Нібы прышэльцы з далёкіх планет,

Пацелі хлапцы ў супрацьгазах.

Капнулі глыбей,

Душы сьціснуў жах,

Рыдлёўкі застылі ў млосьці —

Чаму між астанкаў жывёл ляжаць

Людзей

Чарапы і косьці?

А ў чарапах тых —

KAMUNIKAT.org

То дзірка,

То дзьве,

А косьці,

Сьцятыя дротам...

Маёр —

Пабіты жыцьцём чалавек —

Перахрысьціўся ўпотай.

Чыё сьвятатацтва?

Чый страшны грэх?

Маўчалі зямля і неба.

І ён да машыны

Трушком пабег —

Начальству дакладваць трэба...

За сьветам

Каналі ў вязкім агні

В'етнамскія дзеці,

Пальмы.

І тут загадалі

Пошасьць спыніць

Такім жа сродкам —

Напалмам.

Зьмяшаліся ў попеле,

KAMUNIKAT.org

У зямлі

Каровы,

Коні

І людзі...

Было такое - былі Цівалі...

Ня ведаем мы,

Што будзе.

**"Жалезны наркам"**

*Яднаў Кагановіч у Гомелі сілы,*
*У Віцебску сілы згуртоўваў Яжоў.*

З "Пісьма беларускага народа таварышу Сталіну"

*Л.М. Кагановіч, былы наркам краіны, паплечнік Сталіна, неяк паскардзіўся, што існуе на пеньсію 120 рублёў. Савет працоўнага калектыву Кыргызскага камвольнасуконнага камбіната, калі прачытаў гэтую заметку, пастанавіў штомесяц з фонду сацыяльнага разьвіцьця пералічваць ветэрану партыі 300 рублёў.*

*Газета "Труд", № 97 за 1991 год*

Брыдзе па Маскве ён,

Згарбелы,

Пахілы,

З кефірам разноска ў дрыжачых руках,
Якія калісь мелі гэткую сілу,
Што жыцьці мільёнаў
Змалочвалі ў прах.
Яны помняць смак
Рэзалюцый расстрэльных,
Размашыста,
Гонка аловак вялі.
У "працы стараннай",
Нібыта ад кельні,
Ня сходзілі з пальцаў яго
Мазалі.
Пра літасьць забудзься,
Спагады — нікому,
І Кобу прыгадвай,
Як бога,
Сьпярша.
Ён так і сказаў:
"У жалезных наркомаў
Павінна быць толькі жалезнай
Душа".

Крывавае бойні
Стваральнік і сьведка
Затульвае твар у каўнер паліто.

Старыя яго пазнаюць
Толькі зрэдку,
А для маладых
Гэты мамант —
Ніхто.

Брыдзе паціхеньку ў зьнямозе і скрусе,
Лянотныя думкі,
Бы ўзімку — чмялі.
Ня чуў і ня ўчуе ён
Стогн Беларусі,
Дзе ёсьць Курапаты,
Дзе ёсьць Цівалі...
Так жыў у Маскве,
Ацішэлы,
Пахілы,
Пакуль не скруціўся пятлёй
Доўгі шлях...
А ім гуртаваныя
Чорныя сілы
Зноў вяжуць наш дзень
Па нагах і руках.

**Статак**

Моўчкі дарогаю, пыльнай, заклятай,
У невядомасьць клыпае статак.
Клыпае статак з жаданьнем адзіным —
"Дайце кармушку!" Аж сочыцца сьліна.
Сьліна сьцякае ў пясок, што як прысак,
Цягнуць яе скамянелыя пысы.

Гены набытыя — хочацца момніць,
Момніць і момніць, нічога ня помніць.
Розум і рукі — даўно на прыколе,
Сунецца статак на могільнік долі.

Дурнем памрэш, бо нічога ня ўкраўты,
Сунецца статак на могільнік праўды.
Нехта цікуе: "Якой жа ты масьціі?"
Сунецца статак на могільнік шчасьця.

Нехта чужую апратку прымерыў,
Сунецца статак на могільнік веры.
Нехта па лагернай пайцы скуголіць,
Сунецца статак на могільнік волі.
Ценем злавесным — з Чарнобыля хмары,
Сунецца статак на могільнік мары.
Сьмерць — як збавеньне, ня хочацца лекаў,

kamunikat.org

Сунецца статак на могільнік веку.

Цішу парушыць слабое рыканьне.
Зрэдку рыканьне.
А болей — маўчаньне...

Пастыраў статку ня трэба ніколі,
І пастухоў дастаткова жывёле.
А ў пастухоў замест пуг — аўтаматы,
Пад іх наглядам сунецца статак.

Хто адаб'ецца, за тым сочыць руля.
Хочацца волі? Усьлед плюне куляй.
Так і хадзіцьме па крузе да скону:
З зоны старое — у новую зону.

**Наш дзень**

> *У сталінскіх калымскіх лагерах нам выдавалі на дзень 800 грамаў хлеба і тры разы па місе баланды.*
>
> *З успамінаў вязьня*

Дзяржава раскрадзена.
З гэтай прычыны
Цяпер пад крылом правадырскай рукі

kamunikat.org

Малоціць парламент пустую мякіну,
Сядзяць жабракі.

За кратамі вокан —
Пахмурнае неба.
Цікуюць за намі — галеча, бяда.
Зарплаты хапае на паечку хлеба...
А дзе ж баланда?

**Мне чуецца гул грамадзянскай вайны**

Жылі ад крыві да крыві.
І заўсёды,
Зваліўшы навалы цяжар
Са сьпіны,
Жаданьне адно высьпявала ў народа:
"Каб болей ня ведаць ніколі вайны!"

Ды толькі варожасьць уелася ў косьці
І душы грызе ад відна да цямна.
Пад попелам шэрым
Нянавісьці,
Злосьці
Гарачаю іскраю
Тлее вайна.

KAMUNIKAT.org

Хоць ёсьць незалежнасьць,

Але і сягоньня

Павагі няма да сівой даўніны.

У новых нападках

На Сьцяг,

На Пагоню

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Цярновы вянок

Не зьнялі з роднай мовы,

Ды зноўку яе

Валакуць да сьцяны.

Калі забіваюць

Матуліна слова,

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Да Бога расчынены

Кожнаму дзьверы,

Але і ў сьвятое ўбіваюць кліны.

У спрэчцы

За самую "лепшую" веру

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Зямля чырванее,

Калі хлусяць людзі,

KAMUNIKAT.org

Крывёй пахне

Мора і кропля маны.

У тэле-газетных

Распусьце і брудзе

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Спавіты нябёсы

Злавесным смуродам,

Атручаны скрозь

Наш прытулак зямны.

У бесперапынным змаганьні

З прыродай

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Цяжэе галечы хатуль

За плячамі,

І сьцішыўся люд:

"Як дажыць да вясны?"

У доўгім,

Зацятым,

Галодным

Маўчаньні

Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

Мы звыклі ў цяжкую хвіліну

Кідацца

На пошук чужой,

А ня ўласнай віны.

KAMUNIKAT.org

І ў тым,
Што на ўсё
Ёсьць у нас апраўданьне,
Мне чуецца гул грамадзянскай вайны.

**Лёс**

Махляры выглядаюць і сёньня
Прыстойнымі...
Я ж ня звык мітусіцца
Туды ды сюды.
І застойныя,
І застольныя —
Гэта нашы,
Дакладней,
Мае гады.

Не знарок,
А па даўняй інерцыі
Часта я
Паўтараў разам з гуртам
Старыя грахі.
Выгінастыя,
Пакручастыя —
Гэта нашы,

KAMUNIKAT.org

Дакладней,
Мае шляхі.

Жыў,
Пісаў,
Ды ня змог дакапацца
Да ісьціны,
А таму атрымаў,
Як належыць,
Спаўна.
Не пазбудзешся,
Не адхрысьцішся —
Гэта наша,
Дакладней,
Мая віна.
Між учора і заўтра,
Разьбіты дакорамі,
Моўчкі стаў,
Не хаваю ні ўсьмешкі,
Ні сьлёз.
За плячамі —
Жыцьцё...
Хоць балюча і сорамна,
Не кляну,
Не кляну...

KAMUNIKAT.org

Незваротны лёс...
Ніякою малітвай
Душа не палечыцца.
Хоць жывы,
Ды расьпяты
Шапчу на крыжы:
"Прыдуць новыя,
Прыдуць лепшыя...
Нарадзіцца ім памажы...
Памажы..."

**Апошні шанц**

Апошні шанц дала гісторыя,
Каб не спыніўся ў вечнасьць лёт
Тваіх надзей,
Яшчэ няскораных,
Спакутаваны мой народ.
Апошні шанц дала гісторыя,
Каб захаваць сябе,
Свой род.
Аты,
Зьнямелы і зашораны,
Каму глядзіш сягоньня ў рот?

Тым, хто карміў
І корміць казкамі
Пра сыценькі імперскі "рай",
Хто падае з купецкай ласкаю
Нішчымны хлеб,
Як каравай.

Хто за мяжу
Сплаўляе тонамі
Дабро,
Што ты гарбом нажыў,
А сам паўзе
З жабрачай торбаю:
"Старэйшы брат,
Дапамажы!"

Хто і ў Маскве
Фальшывак бурбалкі
Пускаў,
Чакаў
Свой "зорны час",
А прыпякло,
То ўцёк да бульбачкі
І пханых пальцамі
Каўбас.

KAMUNIKAT.org

Хто ваяваў супроць уласнасьці,
А зараз
Уладарыць ёй...
Якой яшчэ ты хочаш
Яснасьці,
Народ,
Задураны хлусьнёй?

Вакол сябе
Зрабі агледзіны,
Адрынь падману каламуць,
Убач,
Што зроблена
Суседзямі,
Як людзі іншыя
Жывуць.

І зразумей:
Яшчэ ня страчана
Магчымасьць
Дом свой збудаваць.
Твой розум,
Рукі,
Мова матчына

Пасобяць духам акрыяць.

Апошні шанц дала гісторыя...
Свой шанц,
Народ мой,
Скарыстай.
І ажыве прыгнётам зморaны,
Забыты Богам
Родны край.

**Эпілог**

*Беларусь, твой народ дачакаецца*
*Залацістага, яснага дня.*

*М. Багдановіч*

Па цаліку праз белыя палі
Мкне вершнік, не шкадуючы каня.
І чуцен голас: "Збудзішся калі,
Народзе мой — крывіцкая радня?"

Зноў каркаюць над краем крумкачы —
Прыйшла пара сумленна даць адказ.
Ад гэтага нікому не ўцячы,
Глядзяць нашчадкі з вечнасьці на нас.

Малюся на руку, што узьняла

Навечна бел-чырвона-белы сьцяг.
Над ім, сьвятым, разьвееца імгла,
Пачатак быў, ня спыніцца працяг.

Сьлязу, што выбягае на шчаку,
Асушаць промні сонечнага дня...
Праз нашы душы, як па цаліку,
Мкне вершнік, не шкадуючы каня.
1994

KAMUNIKAT.org

**Зязюля**

(паэма)

*Васілю Быкаву*

**НА БЕРАЗЕ ТЫМ**

На беразе тым, што заўсёды мне сьніцца,
Куды з ціхім жалем гляджу праз гады,
Я сеў на замшэлы валун ля крыніцы,
Паўнюткай, як вока, жывое вады.
Нічога яшчэ не набыў і ня страціў,
Абмацваюць далеч
І позірк,
І слых.
А ў сьвеце, нібы перад сьвятам у хаце,
Так чыста-ўрачыста, што стойваю дых.
І сонца,
Як мама,
Цалуе ў макушку,
І вецер,
Як тата,
Кудлачыць віхры...
А я моўчкі слухаю вешчую птушку —
Кувае зязюля ўдалёкім бары.

kamunikat.org

Куваньне яе дзьверы ў храм расьхінае,
Дзе трэба ўпарозе прыстоіць сьпярша.
Якая мне выпадзе доля зямная? —
Прад тайнай прароцтва нямее душа.

Над берагам тым, што трава спавівае,
Аблокі Вушаччыны ў вечнасьць ляцяць...
Кувае зязюля мая баравая —
Заведзены Богам гадзіньнік жыцьця.

**"КУ-КУ!"**

Беларусь накрыла нячыстая сіла,
А дзеці купаюцца ў стаўку...
"Ку-ку!"
Качаюцца весела ў пяску...
"Ку-ку!"
Падстаўляюць галаву вянку...
"Ку-ку!"
Кідаюць чарніцы за шчаку...
"Ку-ку!"
Кланяюцца баравіку...
"Ку-ку!"
Зязюля стараецца, вяшчуе:
"Ку-ку!.. Ку-ку!.."
А сьмерць за імі цікуе:

KAMUNIKAT.org

"На якім жа гадку?.."

"Ку..."

## СУЧАСНАЯ БАЛАДА

Суцяшалі яе:
"Памірае апошняй надзея..."
І матуля малілася Богу
І верыла ў цуд.
Дні і ночы ўзьнясілены,
Зморany тварык глядзела...
Дагараў, як васковая сьвечка,
Сынок ад пакут:
"Ой, сынок, мой сыночак,
Я ж цябе насіла — галасіла,
Раджала — памірала,
Гадавала — гаравала..."
Дагарэў.
Паляцеў.
Не дагнала душой беспрытульнай,
Хоць за ім,
Нібы птушка,
Адчайна рванулася ўсьлед.
І зязюляю шэраю
Стала навечна матуля,
Для яе на пагосьце

Сышоўся цяпер белы сьвет.
"Прыляцела зязюленька
Ды сказала: "Ку-ку!
Падай, падай, мой сыночак,
Хоць правую руку..."
— Ой, мая ты маці,
Рад бы дзьве падаці:
Сыра зямля, жоўты пясок —
Не магу я ўстаці...
Сьвет імкліва старэе,
А могілкі скрозь —
Маладзеюць...
І зязюля начуе і днюе
На родным грудку.
У яе ўжо няма
На жыцьцё аніякай надзеі,
Ды надточвае век
Нашым дзецям
Балючым: "Ку-ку!.."

**КАЛЫХАНКА**

Мне часта мроіцца,
Сьніцца адно і тое ж,
Назіраю, быццам з галёркі:
Зямля гайдаецца

Калыскай пустою
На цьвічку самотнае зоркі.

І ўсё, што з маленства
Здавалася звычным,
Напаўняецца сэнсам новым.
Грымяць над планетай
Апакаліптычна
Калыханкі ціхія словы:
"Прыляцелі чыжыкі,
Парабілі крыжыкі.
Прыляцелі вароны,
Ударылі ў звоны..."

**У ЗОНЕ**

У бары зязюля кукуе,
Ніхто зязюлю ня чуе...
Прыйшла бяда на ўсе часы.
Трава залетавала без касы...
Поле бяз коласа...
Хаты без людзей...
Печы без агню...
Калодзежы без вады...
Палыном зарасьлі сьляды.
Вось тут і ўспомніш пра Бога,

KAMUNIKAT.org

Глянуўшы ў вочы бяды...
Не курыць, не пыліць дарога,
Дарога — у нікуды.

**СЬЛЯЗА**

Ад тых звар'яцелых,
Выгнаньніцкіх дзён
У горле бунтуе камяк...
Дзяўчынка з Палесься
На мінскі перон
Ня хоча сыходзіць ніяк.

Хатуль, нібы горб...
Беларускі багаж...
Ён першы ў яе на вяку.
Як зьнічка трывожнае неба наўсьцяж,
Сьляза перасекла шчаку.

Каб нашага гора глыбіні спазнаць
Паміж мітусьні, драбязы,
Ня трэба ўсе сьлёзы Айчыны зьбіраць...
Мне досыць і гэтай сьлязы.

**МАДОННА**

Асеньнім лістам сэрца затрымцела,

Скульптуру тую абмінуць ня мог —
Красы нязнанай маладое цела
Было без галавы,
Бяз рук,
Бяз ног.
Глядзеў на мармуровую мадонну,
І мурашы прабеглі па сьпіне.
Такой жа, як яна, безабароннай
Ты,
Беларусь,
Тады здалася мне.
Я шэпт пачуў твой:
"Літасьцівы Божа,
Навошта асудзіў мяне на зьдзек?
Чаму маю душу і цела можа
Нахаба кожны гвалціць зь веку ў век?"
А Ён маўчаў,
Хоць ведаў да драбніцы,
Хто награшыў,
Хто вінаваты ў тым,
Што воля Беларусі толькі сьніцца,
Што слава разьлятаецца, як дым.
А Бог маўчаў...
Прад вечнасьцю бяссоннай
На доле колкай зорнае жарствы

Сама ў сябе пыталася мадонна:
"Як жыць бяз рук,
Бяз ног,
Без галавы?.."

**МЫ**

Вецер — з Усходу,
Вецер — з Заходу...
А беларусы чакаюць пагоду.

Дасюль мы лічым сябе народам,
А ў жылах цішыцца рабская кроў.
Жывем, драбнеючы год за годам, —
Нашчадкі воінаў і плугароў.

Усё пры нас, здаецца, — ня зломкі,
Але не спяшаем стаць на крыло.
Ну паляцім, а хто ж нам саломкі
Падсьцеліць, каб падаць куды было?

Пра вечнасьць думаецца з узростам...
Што нашыя жыцьці ей дадалі?
Бо ўсё канчаецца вельмі проста —
Чатыры дошкі і сажань зямлі.

З пратухлай зоны дасюль ня выйшлі,
Уеўся ў душы смурод турмы.
А што прызначыў нам Усявышні —
Відаць, ніколі ня ўведаем мы.

Вецер — з Усходу,
Вецер — з Заходу...
А беларусы чакаюць пагоду.
І ні роду, ні плоду,
Як той камень у воду...

## ГАЛАСАВАНЬНЕ

Нічога ня бачым, нічога ня чуем:
Праўда галосіць, а мы "за!" — галасуем,
Воля галосіць, а мы "за!" — галасуем,
Доля галосіць, а мы "за!" — галасуем...
І самі галосім, але "за!" — галасуем.

## МАЛЕНЬКІЯ ЛЮДЗІ

*"Мы — людзі маленькія, хай думае начальства".*

*Абыходкавы выраз*

Маленькія людзі вялікай бяды
Ня маюць даўно над галовамі даху.
Іх дом,

kamunikat.org

Што ўрастаў у зямлю праз гады,
Накрыты цяпер не страхою,
А страхам.

Маленькія людзі вялікай бяды
Зьмірыліся з гэтым,
Ня рвуцца на волю.
Навошта?
Ім місы пустой баланды
І хлеба счарсьцьвелага
Лусты даволі.

Маленькія людзі вялікай бяды
Шануюць ня Бога,
А чарку і скварку.
Калі накуляюцца добра,
Тады
Ці плачуць цішком,
Ці кідаюцца ў сварку.

Маленькія людзі вялікай бяды
Валодаюць зброяй адзінаю —
Матам.
Усіх пасылаюць туды-растуды,
А іх — пад дубінкі і пад аўтаматы.



KAMUNIKAT.org

Маленькія людзі вялікай бяды
Ня думаюць ні пра дзяцей,
Ні пра ўнукаў.
І нават з чарнобыльскай даўкай жуды
Ня выбрацца ім да сьвятла
Без прынукі.
Маленькія людзі вялікай бяды,
Няўжо вы заснулі навек,
Назаўжды?

**ГНЯЗДО**

Хоць вякі ў турботах прамінулі,
Ды дарэмна — знаку не відаць...
Беларусь — гаротная зязюля,
Як і ў той,
Няма ў цябе гнязда.

Ты суседзям дзетак падкладала,
Вырасталі — ведаў сьвет пра іх!
А сама пад крылы захінала
Пустадомкаў свойскіх і чужых.
І яны тутэйшыя нібыта,
Ды даўно плююць Айчыне ў твар,
Бо для іх наш край з усім набыткам —

KAMUNIKAT.org

Сытая кармушка і тавар.

Кожнаму прарабу выраджэньня
Не патрэбен Адраджэньня гмах.
Ціснуцца ў зацятым ачмурэньні
Ад свайго пад нейчы цёплы дах.

Жабракоў чужына не прытуліць.
Сэнс разумны цвёрда кажа: "До!"
Беларусь — бяздомная зязюля,
Трэба віць табе сваё гняздо.

**КРЫЖ**

Мова дадзена Богам,
Слова было найперш...
Прэч ад мяне, зьнямога!
Духам ня падай, верш!

З верай у лёс народа
Кроч праз глухі натоўп.
Ён няўцямна заўсёды
Праўду пад рэбры тоўк.

Яшчэ за туманам падману ня відна нічога,
Але праз любоў і пакуты пралегла дарога.

Пад грузным крыжам гнуцца радкі і строфы,
Іду ўсьлед за імі адчайна і я — на Галгофу.

Шлях знаёмы, ня новы...
Грукаюць малаткі.
І ў дзяржаўную мову
Можна загнаць цьвікі.

Можна, ды што пакінеш
Дзецям сваім, беларус?
Мусіш і ў дамавіне
Несьці праклёну груз.

Хутка зьмяце, як вецер,
Семя пустое час.
Будуць усе на сьвеце,
Толькі ня будзе нас.

На Герастата славе
Высака не ўзьляціш,
А на сабе паставіш
Самы апошні крыж.

**БЕЛАРУСКАЯ ПЕСЬНЯ**

Ляцела зязюля

KAMUNIKAT.org

Цераз нашы сёлы:

— Чаму вы, мужыкі,

Хмурны, невясёлы?

Досыць моўчкі гараваць

Часінаю весьняй.

Паслухайце мяне,

Я прынесла песьню:

*Яшчэ не прысталі гарачыя коні,*

*Яшчэ не загусла адважная кроў.*

*Зьбірае сыноў беларускіх Пагоня І Сьцяг,*

*Што пад Грунвальдам вёў ваяроў.*

*Зноў над доляю і над воляю*

*Кружаць хцівыя крумкачы...*

*Ды няўжо бяду не адолеем,*

*Крывічы мае, Крывічы?*

*Сьвятыні і мову ня ўдасца заплямiць,*

*Хай ведаюць гэта усе хіжакі.*

*Гартуе наш дух неўміручая Памяць,*

*За намі — вякі І прад намі — вякі.*

*Зноў над доляю і над воляю*

*Кружаць хцівыя крумкачы...*

*Ды няўжо бяду не адолеем,*

*Крывічы мае, Крывічы?*

*І прыйдзе той час,*

*Сьціхнуць спрэчкі і сваркі,*

*Мы дружнай сям'ёю засьцелем абрус,*

*Каб радасна ўзьняць крышталёвыя чаркі*

*За веліч і славу тваю,*

*Беларусь.*

*Зноў над доляю і над воляю*

*Кружаць хцівыя крумкачы...*

*Ды няўжо бяду не адолеем,*

*Крывічы мае, Крывічы?*

**У БАРЫ ПАД БРАГІНАМ**

Маўкліва ля сосен стаім,

У плечы галовы ўгнулі...

Ляжаць на імху баравым

Дзьве мёртвыя птушкі —

Зязюлі.

І сэрцы раструшчвае жах,

Сьляза выпальвае вочы.

Скалела вяшчуньні ляжаць,

Што людзям жыцьцё прарочаць.

Дакуль будзем піць талакой

Бяздонны кубак атруты

На горкай зямлі, да якой
Пакутамі мы прыкуты?

Змахнула сьлязу далонь...
(Каб зь ёю і гора - разам...)
Пытаньні разьдзёўбваюць скронь,
Ды толькі няма адказу.

Маўкліва ля сосен стаім,
У плечы галовы ўгнулі...
Ляжаць на імху баравым
Дзьве мёртвыя птушкі —
Зязюлі.

**ПАКАЯНЬНЕ**

Рэха самай крывавай, вялікай вайны
Не заціхла дасюль,
Адгукаецца...
Каб з душы ськінуць камень былое віны,
Немцы едуць
За нацыю каяцца.

Прымірэньня бальшак і цяпер не прамы,
Ды на ім людзі ўсё ж сустракаюцца.
Талакою будуюць бальніцы, дамы...

Потам і мазалём Немцы каюцца.

Хочуць нам памагчы і малы, і стары,
Бо спагада з бядой не звыкаецца.
Шлюць сюды не падачку,
Ад сэрца дары —
Маркай крэўнай сваёй Немцы каюцца.
І ў Германіі поўна адгэтуль гасьцей,
Бо між намі адлегласьць сьціскаецца.
Лечыць,
Песьціць яна беларускіх дзяцей —
Ласкай і дабрынёй
Немцы каюцца...

А свае прыкарытнікі нават бяду
Скарыстаць для нажывы сьпяшаюцца.
Столькі год са скарбонкі журботнай крадуць,
На катэджы крадуць і на дачы крадуць,
На ваяжы крадуць, на гулянкі крадуць...
Людзям хлусяць,
І зноўку крадуць і крадуць...
І ніколі, відаць, не пакаюцца.

# Сьвечка

Сьвечку тваёй душы
У Госпада папрасіла
І ў цнатлівай цішы
Зацэпліла Еўфрасіньня.

Сьвечку тваёй душы
Сусьвет тады не адрынуў.
Полымя ўзварушыў,
Панёс праз вякі Скарына.

Сьвечку тваёй душы,
Калі ўжо яна згасала,
Засьцерагчы сьпяшыў
Радком і крывёй Купала.

З цемрадзі і глушы
Ісьці да сьвятла далёка.
Сьвечку тваёй душы
Дасюль пільнуюць прарокі.

KAMUNIKAT.org

Іхняй няма віны,

Што люд не прыняў навукі.

Аб Беларусі сны

Ня сьняць прадажныя ўнукі.

Грэх і сьмерць — спарышы,

Таму і прыйшла расплата:

Бацьку сын задушыў,

І брат забівае брата.

Стронцый наскрозь прашыў

Грудзі зямелькі гаротнай...

Шмат ты, люд, награшыў,

Не саграшы беззваротна:

Толькі не патушы

Сьвечку сваёй душы!

**НА БЕРАЗЕ ГЭТЫМ**

На беразе тым, дзе туман васільковы

Калышацца ў жыце, яшчэ маладым,

Былі і сумленьне, і шчырыя словы...

Усё засталося на беразе тым.

На беразе гэтым — часіна распаду,

Зямлю запалонілі зноў чужакі:

KAMUNIKAT.org

Паланій і літый,
Рутэній і радый
Сьмяротны свой баль
Будуць правіць вякі.

На беразе гэтым — нязбытнае гора,
Прычына бясконцых, нязьлічаных страт.
Хварэе народ, Бо ня сёньня,
Ня ўчора
Душы беларускай пачаўся распад.

І доўжыцца, доўжыцца гнюснае ліха,
А зараз стаілася ў новым рыўку:
Манкурцтва і здрада,
Нянавісьць і пыха,
Як зьмеі, спляліся ў пачварным клубку.

Трывожнаму сэрцу да скону нудзіцца
Над доляй Айчыны балеснай маёй...
На беразе тым Шчасьце меў нарадзіцца,
На беразе гэтым
Я стану зямлёй.
А покуль ёсць сілы — люблю і трываю,
І верую ў розум,
У вечны працяг...

Кувай жа,

Зязюля мая баравая, —

Заведзены Богам гадзіньнік жыцьця.

1995

KAMUNIKAT.org

## Пасьляслоўе

Лёс кнігі "Гэта мы" ў нечым мае падабенства з пакутніцкай доляй майго народа. Ідэю яе выданьня выказаў народны пісьменьнік Беларусі Васіль Быкаў яшчэ ў 1995 годзе. Ён жа напісаў прадмову, сьціслую, але такую глыбокую і ўсеахопную ў асэнсаваньні гістарычнага шляху беларусаў. Меркавалася, што кніга будзе надрукавана ў 1996 годзе Фондам Сораса да дзесятай гадавіны Чарнобыльскай трагедыі. Аднак па вядомых чытачам прычынах гэта ня зьдзейсьнілася. Пасьля прымалася шмат захадаў, каб ажыцьцявіць задуманае, але яны сталіся марнымі ў нялёгкіх варунках нашага жыцьця. Таму я сардэчна ўдзячны ўсім, хто спрыяў з'яўленьню кнігі ў сьвет, хто канкрэтна меў да яе выпуску дачыненьне. Гэтым самым мы разам выканалі пажаданьне вялікага нацыянальнага пісьменьніка, мудрага, слаўнага чалавека і пакланіліся яго сьветлай памяці.

*Аўтар*



Дорогий Сергію,

[illegible] „Монолог" [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

1997 р. [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

[illegible]

[illegible]

Лютий 2000

1 кастр. 2001

Дарагі Сяргей,

Дзякуй за ліст і за ХЛЕБ, які
нарадаваў нас незвычайна. Ад-
разу відаць спрактыкаванага
піліграма, які ведае, што трэба
для дамашняй гасьціны.
Твае маладзёны наведалі нас,
расказалі пра мілую жонку.
Яны нам дужа спадабаліся,
асабліва Света, якую я памятаў
яшчэ з дашкольных гадоў. Але —
змянілася, як і належыць. Ды й
дзеці ваш — слаўныя маладыя чалаве
Пры гэтым шлю дзесятку апавяданьн
можа, на пачатку новага года
паставіце яго ў «Полымя». Свае

тут таксама не пахвалюся —
найперш пачынае здаваць здароўе.
А медыцына тут ніякая, абсалютна.
Таму, відаць, прыйдзецца вяртацца
— хочацца-не хочацца. Хаця і там
мала радасці, у тым ліку і на-
конт здароўя. Магчыма і — таму
сьведчаньне...

А палітыка?.. Палітыка здыхае,
бо ўся яна або зверхлівая, або
нямоглая. Як і народ, які яшчэ
не нарадзіўся. Але калі дагэтуль
не нарадзіўся, дык ужо і не на-
радзіцца. У XXI ст. гэта — норма.
Засталіся толькі аскалёнкі ў вы-
глядзе т. зв. творчай інтэлігенцыі.

Шчасця вам з Ліляй і ўдачы.
Да шматгоддзя!

І яшчэ — прывітанне самотнаму
бацьку. Дай яму Бог!

Абдымаю — Васіль Б.

І. М. — таксама кланяецца.

## Кнігі Сяргея Законьнікава

«Бяседа», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973

«Устань да сонца», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976

«Пакуль жыве мая бяроза», Мінск, «Мастацкая-літаратура», 1981

«Вера, надзея, любоў», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1983

«Встань раньше солнца», Москва, «Советский писатель», 1985

«Прысак часу» (выбранае), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1986

«Сутнасьць», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987

«Вечная далеч», Мінск, «Юнацтва». 1987

«Заклінаньне», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1991

KAMUNIKAT.org

«Сьвятая воля», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1993

«Беларускае сэрца» (эсэ, публіцыстыка), Мінск, «Беларусь», 1993

«Вячэра пад райскім дрэвам» (эсэ, нарысы), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1996

«Czarny kon Apokalipsy» («Чорны конь Апакаліпсісу»), Warszawa,

«Pod wiatr», 1996

«Лістам дарога запала...» (выбранае), Мінск, «Мастацкая літаратура», 2000

«Пътят на душата» («Шлях душы»), София, «Славяни», 2002

Сяргей Законьнікаў нарадзіўся 16 верасня 1946 года ў вёсцы Слабада Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласьці ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Глыбачанскую СШ Ушацкага раёна (1964), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1969).

Працаваў настаўнікам роднай мовы і літаратуры, завучам Клетнаўскай СШ Барысаўскага раёна, карэспандэнтам ушацкай раённай газеты «Патрыёт», другім сакратаром Ушацкага райкама камсамола, загадчыкам адзьдзела сельскай моладзі газеты «Чырвоная зьмена», карэспандэнтам адзьдзела літаратуры і мастацтва газеты «Зьвязда», загадчыкам сектара мастацкай літаратуры адзьдзела культуры ЦК КПБ. На працягу 16 гадоў быў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя» (1986 — 2002).

Аўтар 15 кніг паэзіі, эсэ, публіцыстыкі, нарысаў. Асобныя кнігі выдадзены ў Маскве, Варшаве, Сафіі. Шмат вершаў перакладзена на ўкраінскую, літоўскую, англійскую, нямецкую, іспанскую, італьянскую, сербскахарвацкую, в'етнамскую і іншыя мовы сьвету. С. Законьнікаў пераклаў на беларускую мову творы паэтаў Украіны, Балгарыі, Германіі, Польшчы, Літвы.

Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін піша пра творчасьць свайго земляка так: «Вершы Сяргея Законьнікава з беларускім характарам, а гэта значыць — яны глыбінныя і задушэўныя, сьціплыя, але ня ніцачолыя, яны прызнаюць толькі існае і сапраўднае і не прымаюць усё

паказное, павярхоўнае».

Сяргей Законьнікаў - лаўрэат Літаратурнай прэміі Саюза пісьменьнікаў Беларусі імя Аркадзя Куляшова за кнігу паэзіі «Пакуль жыве мая бяроза» (1982), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Заклінаньне» (1992), Міжнароднай прэміі Польшчы імя Вітольда Гулевіча за кнігу паэм «Чорны конь Апакаліпсісу» (1996), Міжнароднай прэміі Украіны імя Рыгора Скаварады за цыкл вершаў «Жыві, Украіна!» (1997), прэміі таварыства «Беларуска-нямецкія сустрэчы» імя Барыса Кіта за заслугі ў разьвіцьці беларускай літаратуры і ў адраджэньні духоўнасьці (2005). Узнагароджаны медалём «За выратаваньне тапельцаў на водах» (1960), ордэнам «Знак пашаны»(1984).

## Зьмест

Чорная быль

Цівалі

Зязюля

Сяргей Законнікаў **Гэта мы**

Кніга выдадзена аўтарам і ініцыятыўнай групай на ўласным абсталяваньні

Тэхнічная й арганізацыйная падтрымка - спартова-патрыятычная ініцыятыва "Волат"

Наклад 299 асобнікаў

Законнікаў С., 2006

Быкаў В., прадмова

Капцюг А., вокладка, 2006

Шапран С., фота, 2006

Кулеш М., вёрстка, 2006